Эльга Папова

# Пра барашку Небарашку



Мінск
«Беларусь»
2018

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
П17

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

Мастак ***Эльга Папова***

**Папова, Э.**

П17 Пра барашку Небарашку : для дашк. і мал. шк. узросту / Эльга Папова ; маст. Эльга Папова. — Мінск : Беларусь, 2018. — 95 с. : іл.

ISBN 978-985-01-1270-5.

Усе авечкі як авечкі, і толькі Небарашка ўвесь час трапляе ў розныя гісторыі! Заблукаць у лесе? Лёгка! Пасябраваць з ваўком? А чаму не?! Адправіцца з лета ў зіму і пазнаёміцца з эскімосамі?! Для герояў гэтай кнігі няма нічога немагчымага! Ды і, нарэшце, хто акрамя іх выратуе вясёлку ад шэрай мядзведзіцы Хмары?! Перагарні старонку і пачні ўсе гэтыя прыгоды разам з Небарашкай і яе сябрамі!

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-01-1270-5**

© Папова Э., 2018
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2018

Частка 1

# У якой мы знаёмімся з Невярашкай

Жыла на лузе барашка. І такой шалапутнай ды непаседлівай яна была, што вылучалася з усяго статку салідных бараноў, як рамонак сярод ружаў.

Вось ідзе статак на выпас, авечкі ступаюць нага ў нагу, збіўшыся ў шчыльную грамаду, а наша барашка носіцца вакол ды падскоквае пад самае неба.

— Што носішся, гарэза? — пытаюцца бараны.

— Лятаць спрабую! — адказвае тая. — Мару маю — палятаць калі-небудзь бы птушка.

Ці вось яшчэ: жуюць авечкі траву, а барашка галаву задрала ды спрабуе прамяні сонца губамі ўхапіць.

— Што робіш, дурніца? — глядзяць са здзіўленнем авечкі.

— Дык сонца ж такое смачнае! — адгукаецца барашка.

Ці, напрыклад, прыйдзе статак на вадапой вадзічку хлябтаць, а барашка галаву ў возера акуне ды давай бурбалкі носам выдзьмуваць.



— Навошта балуеш? — дакараюць яе бараны.

А яна:

— З рыбкамі паветрам дзялюся, як яны са мной вадою.

Такая вось незвычайная была тая барашка — фантазёрка ды летуценніца. Бараны ў статку лічылі яе небарачлівай, бо ўвесь час з ёй нешта адбывалася незвычайнае і ўліпала яна ў розныя гісторыі. За гэта і празвалі яе Небарашкай.

Частка 2

## Пра Генку і пачатак прыгодаў

Аднойчы ўдзень ішлі авечкі з поля ў засень, надвор'е апошнім часам стаяла сухое і спякотнае, сонца паліла.

Небарашка плялася ў хвасце статку. Рухалася яна задам наперад, носам уткнуўшыся ў траву — так было спадручней кветкі вывучаць. Ніхто ўжо не заўважаў выбрыкі дзівачкі, але перыядычна то тут, то там гучала: «Небарашка, не адставай — згубішся!», «Небарашка, глядзі ў яму не зваліся!», «Небарашка, развярніся ды бяжы хутчэй, бо мы ўжо далёка!».

Небарашка і пабегла, да толькі не за статкам, а зусім ў адваротны бок. Справа ў тым, што адна

з дзівосных кветачак, якую яна нахілілася панюхаць, раптам успырхнула ды паляцела над лугам. Вядома, гэта быў матылёк. Але які! Ні махаон, ні лімонніца, ды ні капусніца, звыклыя для ўсіх. Гэты быў зусім незвычайны: блакітны, бы незабудка, ён сядзеў у траве, а, узляцеўшы ў паветра, змяніў колер на чырвоны, у сонечных промнях зрабіўся памяранцавы, як апельсін. Небарашка скакала за ім, задраўшы нос угару і зусім не гледзячы пад ногі, бо баялася згубіць матылька. А той мяняў колер з кожным Небарашкавым скокам: скок — сіні, скок — зялёны, скок — барвовы, скок — шэры.





Так захапілася Небарашка дзівам, што не заўважыла зусім, як літаральна ў дзесятку крокаў ад яе за тым жа матыльком бег незнаёмы хлопчык. Ён таксама не глядзеў па баках, таму, калі рознакаляровы матылёк, даляцеўшы да лесу, прысеў на трухлявы пень, здарыўся вялікі БАБАХ!

Гэта сапхнуліся Небарашка і хлопчык, адначасова кінуўшыся да пня.

Дзеці паваліліся на траву і пакаціліся кулем у розныя бакі. Спыніўшыся, абодва прыселі, паматлялі галовамі, пацерлі гузы на лбах і пагледзелі, нарэшце, адзін на аднаго.

— Ты хто? — запытаўся хлопчык.

— Я Небарашка, — адказала барашка. — А хто ты?

— Я Генка, — сказаў малы. — Бег за чароўным матыльком.

— І я за ім бегла таксама.

Над узлескам зазвінеў ціхі смех.

Дзеці паглядзелі на пень.

— Ну вы даяце! — голас матылька быў тонкі і высокі. — Толькі не крыўдуйце на мяне, калі ласка! Не магу стрымацца, бо вы так смешна сапхнуліся!

— А навошта ты нас цвяліў? — нахмурана спытала Небарашка.

— Я не цвяліў вас, — адказаў матылёк. — Проста мне трэба было паразмаўляць з вамі без староннiх, вось я і заманіў вас на гэтую палянку.





— Ну, і дзе ты знікала, гарэза? — спытаў Небарашку галоўны ў статку баран.

— Потым усё распавяду падрабязна, а зараз мне патрэбна ваша дапамога! — папрасіла авечка. — Дзесьці тут, на полі, маленькі вясёлкавы матылёк. Яго трэба адшукаць як мага хутчэй і вярнуць да Хмары. Ён памрэ без дажджу. Дапамажыце, калі ласка!

Авечкі, хоць і не вельмі падтрымлівалі забаўкі і фантазіі Небарашкі, кінуліся шукаць матылька. Адна справа — гульня, а тут, калі вырашаецца жыццё жывой істоты — не да жартаў і роспытаў.

Статак хутка разышоўся па полі. Авечкі ўважліва аглядалі траву і кветкі. Небарашка з Генкам шукалі таксама. «Матылёк! Матылёк!» — клікалі яны.

На шчасце, неўзабаве той знайшоўся. Маладзенькі баранчык першым заўважыў саслабелага матылька ў кветках і закрычаў усім астатнім:

— Гэй, ён тут!

Сябры адразу падбеглі. Генка падняў матылька на рукі. Фарбы небаракі былі ўжо зусім цьмянымі, і сам ён ледзь дыхаў.

— Хмара! — паклікала Небарашка. — Хадзі хутчэй сюды. Мы знайшлі яго!

Шэрая мядзведзіца падступіла да Генкі і авечак, дождж, зразумела, разам з ёю — і тыя сталі хутка намакаць. Але ніхто не скардзіўся: пасля двух тыдняў няспыннай спякоты цёплая летняя залева была толькі на радасць.

Хмара падала лапу, і Генка паклаў на яе матылька. Таго тут жа атачылі іншыя вясёл-

кавыя матылькі. Усе былі заклапочаны станам заблуканца.

— Не хвалюйцеся, мы дапаможам яму, — паабяцала Хмара. Матылькі падхапілі хворага сябра і панеслі яго ў неба.

Вясёлка расцягнулася дугой праз усё поле. Адзін яе край тут — каля авечак і мядзведзіцы Хмары, а другі на тым канцы лугу закранаў вёску з маленькімі старымі хаткамі. Там, дзе вясёлка сустракалася з зямлёй, стаяла Генкава бабуля і махала ўнуку рукой.

— Небарашка, я пабягу, — звярнуўся да сяброўкі Генка. — Я ўжо так засумаваў па бабулі!

— Бяжы, зразумела! — адгукнулася Небарашка.

Дождж наскрозь прамачыў Генкаву майку. Буйныя цёплыя кроплі блішчэлі ў валасах хлопчыка. Падскокваючы, ён пабег праз луг у напрамку вёскі, але праз колькі крокаў спыніўся і азірнуўся.

— Небарашка! Ты прыйдзеш да мяне?

— Вядома! — крыкнула ў адказ сяброўка.

Генка памахаў рукой ёй, авечкам і Хмары і, развярнуўшыся, панёсся дадому.



Зразумела, Небарашка прыйдзе да яго ў госці, і не адзін раз. Разам яны будуць бегаць ў лес і купацца ў рэчцы, пячы бульбу ў вогнішчы і гуляць у вясёлыя гульні з іншымі дзецьмі, а стаміўшыся, прыбягаць дадому, дзе Генкава бабуля будзе частаваць малых смачнымі блінамі і пірагамі. Лета доўгае — наперадзе сяброў чакае шмат вясёлых прыгод, але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.









Літаратурна-мастацкае выданне

**Папова** Эльга

ПРА БАРАШКУ НЕБАРАШКУ

Рэдактар *Н. А. Мількевіч*
Мастацкі рэдактар *А. І. Бужынская*
Тэхнічны рэдактар *Ю. М. Раковіч*
Стылістычны рэдактар *Н. Г. Баранава*

3+ Падпісана да друку 14.08.2018. Фармат $60 \times 84^{1}/_{8}$ .
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 8,9.
Тыраж 1000 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь. http://belarusbook.by.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня “Перамога”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна.